БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поўдня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Міңску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 64. Менск. Аўторак 11 чэрвеня 1918 г. Год I

Абвесткі.

Кавярня, па Губэрнатарскай вуліцы, 13, гаспадара Нохама Веселера будзе адчынена штодзенна на далей да адмены.

Гаспадару рэстарацыі па Захараускай вул. 6, Віэнтунці Ліпіну пазволено трымаць рэстаран адчыненым штодзенна. Па панядзелках, чацьвергох і суботах могуць быць адпускаемы толькі малако і малочныя стравы.

Менск 8/VI 1918 г.

Нямецкі Граданачальнік
ГЕРШЭЛЬ.

Менск 11/VI.

Захаванне сваей мовы, свайго быту і старыны,—усяго таго што дае магчымасьць этнографу гаварыць аб асобным народзе, каштавало беларускаму пароду надта дарага.

За гэто заплаціу ен згубленнем сваей інтэллігэнцыі, згубленнем таго стану, які у другіх краех, напрыклад у Прусах, яуляецца найболей нацыянальным,— стану зямяулаcьнікау—заплаціу тым, што з ступені моцнаго дзержауным бытам народу зыйшоу на ступень пары, безпраунаго работніка на чужым полі. Хаця бяднеу народ ні адразу, апушчауся ні без змагання за свае нацыянальныя правы, адступау толькі скараючыся перад сілай і ні адзін раз робячы спробы зноу устаць і заняць у сваім краі пачэснае гаспадарскае мейсцо. Гістарычныя традыцыі былі заусeды жывымі у народзе.

I калі наступіу адпаведны час, народ прайшоуши праз тры сталецці нацыянальнаго уніжэння зноу моцна заявіу аб сабе.

Страта інтэллігэнцыі зьвязаная пахаджэннем з выжэйшымі станамі замянілася цяпер набыткам сваей уласнай народнай інтэллігэнцыі, катоpая ніколі ні прадасьць народных інтарэсау за прывілеі для сябе. Народ зноу мае заступніка, катораго выгадавау у цяжкіх муках і цяпер яму нічога ні боязно,—гісторыя яго ні затопча.

Праудa лік народнай інтэллігэнцыі у цесным значэнні гэтаго слова іщчэ ні надта вялікі і ні адказуе усім патрэбам уваскрасаючай нацыі, за тое праца якую яна пакладае, шчырая і энэргічная, сьцягвае усе болей памоцнікау. I усякі хто працуе на беларускай ніве з надзеяй глядзіць наперад: іщчэ можа год, іщчэ можа два і жыцце на Беларусі зробіцца беларускім, абрыецца нацыянальнымі хварбамі. Інтэллігэнцыя народау, якія ціснулі Беларусь, польскаго і вялікарускаго, пачуе што ей робіцца цесно тутака сярод чужога народу і калі, звыкшыся с краем, захоча астацца тутака, замяніць свае варожыя стасункі да беларускай культуры і беларускаго народу і скарыушыся перад сваей новай доляй пачне служыць яму так як гэто раней рабіла наша інтэллігэнцыя, шукаючы сабе працы у Вялікаросії і Польшчы.

А пакуль што беларуская інтэллігэнцыя павінна працаваць удвояючы і, калі трэба, утрояючы свае сілы сьцягваючы старых працаунікоу ад усюль дзе б яны ні былі.

Гадаўшчына газ. „Вольная Беларусь“.

(28/V-1917 г.=28/V-1918г. ст. ст.)

Прайшоў год выдання беларускай газэты «Вольнае Беларусі» пад рэдактарствам Я. Лёсіка у Менску. Перад намі ляжыць гадавік «Вольнае Беларусі» і, праглядаючы яго у цэлым, відаць як у люстры беларускі год за час пэрэвароту Расіі, пачынаючы ад першых мітынгаў да апошняго дня. Гэтны гадавік можа служыць пекнай настольнай кнігай гісторыі Беларусі за эпоху 1917—18 г.

Ад першаго нумэру прымечаецца таланавітая рука рэдактара, каторы складае матэрыял газэты з вялікім перабoрам і густам, і газэта робіць ўражэнне эўрапэйскай часопісі.

Вельмі зьвертаюць на сябе увагу артыкулы самого рэдактара, што пышуць нацыянальным агнём і закаханнем да Бацькаўшчыны, якія былі схованы у сэрцы іх шаноўнаго аўтора больш як-за дзесяць гадоў—за час яго бытнасьці у далечы ад роднаго краю, у Сыбіры, як высланаго расійскім урадам за «рэвалюцыйнасьць» у 1905-6 г. г.

Покнатой мовы, энэргічнасьцю і вобразнасьцю сваіх выразаў і паэтычнымі зраўненнямі яны робюцца клясычнымі у беларускай публіцыстычнай літэратуры і вельмі жаданно было-б, каб яны былі выданы асобнай кнігай.

За гэты год у «Вольнай Беларусі» друкаваліся розныя капітальныя творы, як «Сымон музыка» Я. Коласа, «Антось Лата»—яго жа, «Ні розумам сьцяміў, а сэрцам—драма К. Вясёлаго, «Залёты»—Марцінкевіча, апаведанні М. Гарэцкаго і інш.

Паміж новымі літэрацкімі сіламі, якія пачалі друкавацца у Вольнай Беларусі ні лічучы старых ведомых паэтаў, як А. Гарун, Ясакар, зьвертають на сябе увагу паэзія Сучаснаго, Маслоўскаго і Макара. Дзеля браку мейсца у нашай газэці мы ні можам удавацца у дэтальныя разборы вышэйпамянёных твораў.

Ад Новаго году «Вольная Беларусь» пачала выдавацца у форме тыднеаго журнала на 8 страніцах. Выдаецца вельмі старанна і густоўна.

«Вольная Беларусь» ад віленскіх часопісаў рожніцца сваім правопісам. Рэформы, якія па гэтай часьці у «В. Б.» зроблены месяцаў 8 таму назад, рэформы гэтыя выклікалі спрэчкі, але большасьць рэформаў згрунтовано на палягчэнні і сыстэматызацыі правіл беларускай граматыкі с фонэтычнаго пагляду.

Тыраж газэты да спыпення почты у Менску быў вельмі салідны, але у тычнасьці з другімі мейсцовымі часопісамі «В. Б.» можа гардзіцца і цяпер сваім тыражом. З вакoлічных мястэчкау і вёсак часто прыходзяць і прыезджаюць у Менск спэцыяльно па «Вольную Беларусь», якая заваевала сабе прыхільных чытачоў па усяму беларускаму краю.

Дзень гадаўшчыны «В. Б.» лічыцца сярод беларускіх дзеячоў праўдзівым сьвяточным днём і усе ад шчыраго сэрца пасылаюць свой падзякуй нітамімаму кіраўніку газэты Я. Лёсіку за вялікую карысную працу на ніве беларускай за гэты год.

Віншуючы рэдакцыю «Вольнае Беларусі» з першай яе гадаўшчынай, жычым ей шмат, шмат гадоў працы на карысьць Бацькаўшчыны.

З. Бядуля.

Агульныя весткі.

ВАШЫНГТОН, 6 гм. «Reuter». На сягонняшнім пасяджэнні ваеннаго габінэту Вільсона разглядаліся выпадкі нападаў нямецкіх падводних лодак, якія здараюцца у амэрыканскіх водах.

ЛЕНДАН. 7 гм. «Reuter». З Нью-Йорку паведамляюць, што нямецкія падводныя лодкі каля пабярэжжа Атлантыкі затапілі агулам 15 параходаў і 2 прыбрэжныя шхуны.

ЖЭНЭВА. 7 гм. «Petit Parisien» паведамляе з Вашынгтону, што у амэрыканскіх водах кружыцца 5 нямецкіх падводных лодак.

ЛЕНДАН, 6 гм. «Havas». Сэр Джэмс Кэмпбэль, лорд найвышшы суддзя Ірляндзіі, назначаны лорд—канцлерам Ірляндзіі замест О'Бріэна, каторы уступіў с пасады і атрымаў дастаонство пэра.

ГААГА. 6 гм. Госпітальны карабель «Koniegin Regente» наскочыў па міну. На ім знаходзілася ангельская дэлегацыя, якая ехала у Гаагу па конфэрэнцыю з немцамі аб вымене ваенна-палонных. Нескольки чалавек с каманды карабля загінуло. Нішчасьце здарылося блізь ангельскіх берагоў, больш-менш у 20 мілях ад Леманбайк.

БЭРН. 6 гм. Прэзыдэнт Швэйцарскай фэдэрацыі Калёндэнт азнайміў у народнай Радзе, што Рада фэдэрацыі аддае шмат увагі на уладжэнне міжнароднаго права у будучыне і на стварэнне звязку народаў.

Нізалежна ад гэтаго швэйцарскі урад думае запрапанаваць сваё пасрэдніцтво ваюючым дзержавам як толькі будзе відно, што яны хацеліб гэтаго.

У будучыне усе ніпаразумення паміж народамі павінды залагоджывацца палюбоўным судом а ні войнамі.

ПАРЫЖ. 7 гм, «Reuter».

Урадова паведамляюць: Група нямецкіх самалётаў у лічбе 20 кружыць над французскімі ліпіямі і скіравалася у бок Парыжу. Паўзяты способы для абароны. Нескольки бомбаў ужо скінуто.

ДРЭЗНА. 7 гм. Сюды прыбыў першы таварны поезд з Украіны у складзе 15 вагонаў збожа, цукру і тлустасьці.

БЭРЛІН. 8 гм. «Вольф». Пунктам першым дзеннаго парадку у Рэйхстагу быў выбары маршалка і двух віцэ-прэзэсаў.

Першымі адбыліся выбары маршалка. С паданых 280 галасоў 270 падано за дэпутата Фэрэнбаха (цэнтр). Фэрэнбах сказаў, што прыймае выбар і заняў мейсцо маршалка.

БЭРЛІН. 8 гм. «Вольф». Пасьля выбараў дэпутата Фэрэнбаха на маршалка, віцэпрэзэс. Паашэ азнайміў, што

ён зракаецца з свайго мейсца. За гэтым адбыліся выбары трох віцэпрэзэсаў.

Выбарных картак было пададзено 269 і паміж імі 2 белыя. Дэп. Довэ атрымаў 262 галасы, Шэйдэман 194 галасы і Пааше 187 галасоў. Усе трое сказалі што прыймаюць выбар.

З Украіны

КІЕУ, 6 гм. «Вольф» Рада міністраў пастанавіла нацыяналізаваць і перадаць міністэрству земляробства землі б. «габінэту Яго вялікасьці» — 5000 дзесяцін і 100,000 лясоў с цукроварнямі і багатым інвэнтаром.

КІЕУ, 6 гм. «Вольф» Учора выслана да румынскага ураду нота—адказ ураду Украіны у справе Бэсарабіі. Украіна стаіць за тое, што малдаускі парлямэнт ні меў уповажнення ад народу на падачу голасу у справе прылучэння Бэсарабіі і што насяленне Бэсарабіі хацело-б прылучыцца да Украіны, з якой яе вяжуць ваенныя і экономічныя інтарэсы.

КІЕУ, 6 гм. У Кіеве і Харкаве началося энэргічнае судовае сьледство процiў спэкулянтау на таварах і валюце.

Весткі с Польшчы.

ВАРШАВА, 7 гм. «Вольф» Б. старшыня міністрау, Кухаржэўскі, каторы меўся прыняць учасьце у нарадах прэзыдыуму Польскага Кола у Кракове, як старшыня варшаўскай урадавой дэлегацыі, захварэў. Замест яго у Кракоу выехау старшыня міністрау Стэчкоускі.

— Нідаўна рада міністрау разглядзела праэкт уставы выбарау у абедзьве саймовыя ізбы. (У сойм і сэнат) апрацованы саймова-конституцыйнай камісіяй. Прыняты праэкт будзе пададзены на зацьвярджэнне Рэгенцкай Радзе, а пасьля будзе унесены у Раду Стану. (Дзержаўная Рада).

— На 85 году жыцця памер гр. Мечыслау Квілецкі, член прускай палаты паноу, адзін з найзаможлівейшых польскіх земляўласьнікау у Познані.

Весткі з Расіі.

— Масква. З нікаторых часаў расійскаму савецкаму ураду стало вядома, што члены рэакцыйнай партыі розных напрамкаў пробуюць падарваць уласьць, а так—само аўтарытэт Савецкага ураду. Цяпер, урадуці, удалося раскрыць загавор і арэштаваць зачыншчыкаў. Пры гэтым «установлено, што кірункі руху знаходзяцца у Лендане, адкуль яны патрымліваюць старанныя зносіны з рознымі агентамі дзяржаў—згоды у Маскве. Бунт чэшско - словацкіх атрадаў у Чэлябінску, Пэнзе, Омску і Уфе і ужо уціхаміраныя у Саратове бунты, знаходзіліся у цеснай сьвязі з раскрытым цяпер загаворам. Рэакцыйныя газэты зачынены, с прычын развівання фальшывых і правакацыйных вестак. Паміж іншым, у гэтых газэтах была пушчэна нісуразная вестка што Савецкі урад цяпер перадае Гэрманіі Сібірскія жалезныя дарогі з усімі установамі і матэрыялам.

— Кіеу 6 VI. Рада народных камісарау апавешчыла галаву Донского ураду, генэрала Краснова, ворагам народу і уне закону.

— Кіеу 6 гм. «Вольф». Урад Дону апавешчае, што закон сакавіка 1917 году аб зьнішчажэнні нацыянальных і рэлігійных агранічэнняў захоўваецца у ростоўскім і таганрогскім акругах. На рэшце донскай тэрыторыі пытанне пакуль што астаецца адчыненым.

— Кіеу 6 гм. «Вольф», Маскоўскія газэты пішуць:

Муратаў атрымаў надзвычайныя поўнамоцтвы. Знойдзено шмат вінавацючага матэр'ялу процiў контр-рэвалюцыянэраў, асабліве процiў «сьвязку абароны айчызны і свабоды».

— Подлуг вестак Штокгольмскага коррэсп. «Voss. Ztg.» ангельскімі ваеннымі сіламі на Мурмане арганізуецца выступленне рускіх і фінляндскіх чырвона-гвардзейцаў на граніцы Фінляндзіі. Інструктарамі чырвона-гвардэйскіх бандаў зьяўляюца ангельскія ахвіцэры. У фінляндскай Караліі лічацца з магчымасьцю нападу гэтых бандаў. Маннэр, праводца фінляндскіх чырвона-гвардзейцау, уцёкшы с Фінляндзіі цяпер знаходзіцца у галаўнай ангельскай кватэры на Мурмане.

— Амэрыканскія падатковыя чыноўнікі адкрылі загавор які меў мэтай контрабанды увоз у Амэрыку клейнодаў дома Раманавых вартасьцю на 2 мільёны дол.

— Перавоз б. цара с Тобольску у Екацерынбург зьвязаны як павед. «Exrg. Korr» з адкрыцьцем загавору аб увальненні б. цара с пад арэшту.

У часе рэвізіі у Кн. Долгорукова і адпаго з бышых членаў Сіноду знойдзены паперы подлуг якіх усе было прыгатовано для вызвалення—цара у сакавіку м-цу.

У ўмешканні цара знойдзено 800.000 руб. золатам і паперамі. Варта была падкуплена і замешана у загавор.ы

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Загатоўка картоплі у хуткім часе прыймаецца нямецкімі уласьцямі пад свае кіраўніцтво, с прычын кепскага вядзэння гэтой справы у меськай харчовай камісіі, якая выдавала насяленню гнілую бульбу.

У контролі Л. Р. ж. д. афіцыяльна апавешчэно, што са стараны нямецкіх уласьцей, на аснове распараджэння глаунакамандуючага арміяй, ніякіх асігновак на утрыманне штату контрольных служачых ні будзе.

Такім чынам, жалезн.дар.кантроль мае быць скасаваны.

Губ. вучыцельскі хаурус мае хадатайствавадь перад нямецкімі уласьцямі а назначэнні на пост члена меськ. управы, кіруючаго справамі асьветы бышага дырэктара народных вучылішч менскай губ. д. с. с. Соколова.

Па Л. Р. ж. д. афіцыяльна вытлумачэно, што нямецкімі уласьцямі будуць аплачываемы служачыя па адной эксплоатацыі, але ніяк ні па ліквідацыі.

Апошняя, апрача таго уступіла у паласу аканчання.

Спэкулятыуныя цэны на рэчы жыццевага патрабавання, усе павялічываючыеся, прымусілі нямецкія уласьці, на аснове паказанняў паліцэйскага расьледавання, прыступіць да карацельных мер, якія будуць абнародованы на днях.

У кватэрным аддзелі меськ. управы, фактычна кончылі сваю дзеяльнасьць «агенты» па указанню кватэр, аплачываемыя паміж тым і у другіх аддзелах, дзеля эканоміі па часьці рабочых рук, за малую пры тым плату.

Думаецца, што гэтыя агенты былі патрэбны толькі у ваенны час.

Сінекуры. У міліцыі нейкі Туркін прaслужыў памоцнікам камісара 1-го вучастка каля двух месяцау, атрымоваючы адначасна пэнсію на пасадзе кантралера па збору с кінэматаграфау, а затым яму далі двухмесячны адпуск с пэнсіяй і у той жа час ен быу пераведзены на меські харчовы камітэт.

Меськаю управаю была вынесена пастанова о «несовместительстве» пасад, дзеля якой прычыны—агенту па асьветленню Скерткену, як фуражыру, была урэзана пэнсія у 37 руб.

Меж тым «таварышу» Старобінцу, бышаму сэкрэтаром павятовай харчавой камісіі, было прэдстаулено у управе мейсцо кантралера па збору с кінэматографау з розных увеселенняў, у той час, калі стараслужачыя управы выкідываліся за борт.

Так іх прыкладаў еесьць шмат.

У фэльшэрско-акушэрскім т-ве намечаны на 9 чэрвеня у прыемным пакою ст. Менск Л. Р. ж. д. гадовы сход (у 3-ці раз клічэцца) зноу ні адбыўся, за ніпрыходам большасьці членау.

Болей чым пэуна, што сход наогул ні адбудзецца, паміж тым, карысьнасьць т-ва, іс нуючаго 2 гады, сама за сябе кажа.

Расквятэраванне чыноу штаба Х арміі у цэнтральнай часьці места, спосабам рэквізіцыі пахходзячых кватэр, робіцца, пачынаючы ад 9 чэрвеня.

На сходзе бацькоу і жонак ваенна-палонных адбыушымся у меськ. управе 9 чэрвеня, было рэшэно праз пасрэдство меськіх уласьцей звернуцца да вышэйшага нямецкага камандавання аб звароце палонных на бацькаушчыну.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага Вярхоўна[га] камандавання за 9 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Артылерыйская бітва ажыўлялась ноколькі разоў [вечаро]м і ўсілілася сягоння з рання у вобласьці Кеммеля, па[ўд]нёвей Соммы і на Аўры. Атакі французаў паўднёвей Тіэ[пва]ля і ангельцаў поўночней Бомон-Амеля былі адбіты.

Група арміяу Германскага Кронпрынца.

Баевая дзеяльнасьць усілілася на Уазе. Мейсцовы[я] атакі французаў на поўднёвам беразі р. Эн і паўднёве[й] Урсь нацярпелі ніудачу. Нам націск усходней Кютры да[ў] нам 45 палонных. Амэрыканцы, пробуючы зноў атакава[ць] паўночна захадней Шато—Тьерры, былі адбіты з вялікі[мі] для іх стратамі, паплаціўшыся палоннымі, і адкінуты з[а] іх ісходняе становішчо.

Група арміяу Герцога Альбрэхта.

Пры усьпешным прэдпрыімстве на усходнім беразі Мо[]зэля мы ўзялі палонных.

Лейтэнант Кролль атрымаў свае 24 і 25, фэльдф. Ру[]мей сваю 23 перамогу у паветры.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

У губэрнскім казначэйстве, дзякуючы прыбыушаму па справах атрымання асігновак бугалтэру менскага аддзялення гасуд. банку (эвакуіраванаго у Казань), быу выкладкова раскрыт на вялікую суму пак, маючы сьвязь с бягучымі крэдытамі губ. установау.

Паміж іншымі за апошні час лічба штодзенных паступленяу у губ. казначэйстве — 4000—5000 руб.

Канцэрт два вадэвілі і танцы ні адбываецца у «Беларускай Хаце» у суботу, 8 чэрвеня, па нізалежных прычынах, адложаны на 14 чэрвеня.

Губ. акцызнае упрауленне с цяперашняга памешкання (Захароуская. 83) пераходзіць у дом ляхаускага віннаго складу.

Яго мейсцо займе прыбываючы сюды штаб Х арміі.

Аб адслужэнні уздзячнаго малебствія за пераварот і крушэнне большэвізма нібы то бывшаго апошнімі днямі у Маскве, группа кабет, багамолак у суботу, 8 чэрвеня, звярнулася да эпіскапа Георгія, на што апошні адмовіуся, апіраючыся на нідастатках афіцыяльнага пацьвярджэння факту.

На Троіцкім пляцу у панядзелак, 10 чэрвеня было шмат дроу, дзякуючы чаму цэны на іх ад 16—20 руб. за воз упалі да 12—14 р. (сумесь); бярозавыя—20—23 р. воз.

Курсы беларусазнаўства.

11 чэрвеня лекцыя Эд. Будькі: «Нізалежная ці залежная промысловасьць Беларусі».

Пачатак а 7 гадз.

Весткі с краю.

З Вільні.

— **На працэсіі.** Сёлетняя працэсія, каторая адбылася ні ў самы дзень сьвята Божага Цела, а была перанесена, як заўсёды, с чацьвергу па нядзелю, мела нейкі зусі[м] нізвычайны характэр.

«Вось Кароль каралёў Пан народаў склікае сягоньн[я] свае верныя войскі ў рады. Высока развеваюцца Яго ка[ра]лёрные штандары, зьяюць праменнях сонца Яго знамё[]ны...» так пісаў у дзень пра[]цэсіі «Дзеннік Віленскі». Ад[]нак, на працэсіі мы ўбачылі нешта зусім ніпадобнае: за[]мест штандараў з Імем Бо[жым] над працэсіей разьвеваліся бе[]лые арлы—гэрб Польскаго ка[]ралеўства.

Гэтак каталіцкая працэсі[я] абярнулася ў дэмонстрацы[ю] на карысьць чужой нам дзер[]жавы—Польшчы.

У працэсіі, як што-году прынімалі ўчасьце літвіны. Та[к] сама першы раз выступілі беларусы [прытулак т-ва «Зо[]лак»]. Але ні адны, ні другі[я] ні думалі прыдаваць рэлігій[]най урачыстасьці гасударствен[]нага літоўска-беларускага ха[]рактэру. І, гледзячы на сёлет[]нюю працэсію, было і горка і жаль, што беларусы і літ[]віны, выступаючы офіцыяльна як такіе, на агульна-каталіц[]кай працэсіі, папалі ў гэтка[е] прыкрае палажэнне.

Католік.

—**«Вільня—Менск.»** У серад[у] па абедзі ў салі пры сьв. Юрскім пр. 35 адкрыта выстаўка «Вільня—Менск». На адкрыцці быў галаўнакамандуючы 10 арміяй і начальнік яго штабу. Надробнасьці аб выстаўцы, якая асабліва датыкае нас, беларусаў, мы дамо ў найбліжэйшым нумары.

Выстаўка адчынена кожны дзень ад 10 да 8 гадз.

«Гоман».

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтва «Т-во Заранка.»



Друкарня Я. А. Грынблята.